ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 19 (1055) ● Чацвер, 30 мая 1974 г. ● Цана 2 кап. Газета выходзіць з 1935 г.

ЗАМАЦАВАНЫ ВУЗЫ СЯБРОЎСТВА

ПЛЁННАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

«Правесці сумеснае пасяджэнне з нафедрай дзяржаўнага права Вільнюскага універсітэта, на якім абмяняцца вопытам работы па методыцы правядзення семінарскіх заняткаў па дзяржаўна-прававых дысцыплінах».

(З сацыялістычных абавязацельстваў выкладчыкаў кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва юрыдычнага факультэта).

Такія пасяджэнні адбываюцца штогод двойчы —у Мінску і ў Вільнюсе. Гэтая добрая традыцыя захоўваецца на працягу пяці гадоў.

Вельмі цікава, у вострай сяброўскай дыскусіі праходзяць сустрэчы вучоных. Абавязкова вядзецца адпаведная дакументацыя, усе выступленні і слушныя думкі ўдзельнікаў фіксуюцца ў пратаколах. Карані плённага сяброўскага супрацоўніцтва дзвюх кафедр вядуць у май 1969 года, калі юрфак БДУ праводзіў рэспубліканскую навуковую канферэнцыю па праблемах удасканалення савецкага заканадаўства і дзейнасці савецкіх органаў. Было шмат гасцей з саюзных рэспублік. Сярод іх і літоўскія вучоныя-юрысты. Былога загадчыка кафедры дзяржаўнага права дацэнта Вільнюскага універсітэта Андруса Юозавіча Гэлоту вельмі зацікавіла методыка работы адпаведнай кафедры нашага універсітэта, тэматыка курсавых і дыпломных работ. А праз некаторы час быў заключан і дагавор аб супрацоўніцтве. Першае пасяджэнне адбылося ў Вільнюсе ў час падрыхтоўкі да святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна па праблемах нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва ў творах У. І. Леніна. Затым прайшла сумесная канферэнцыя на тэму «Роля кафедры ў выхаванні студэнтаў».

Карысным і памятным засталося пасяджэнне, праведзенае сумесна з Дзяржаўным камітэтам па ахове прыроды Літоўскай ССР «Аб прававой ахове прыроды Літоўскай ССР». Усе асноўныя даклады падрыхтавалі вучоныя-юрысты з Беларусі.

Варта больш падрабязна расказаць аб апошнім пасяджэнні. З Вільнюса прыехалі да нас шэсць выкладчыкаў на чале з загадчыкам кафедры дацэнтам К. А. Лапінскасам. Ад нашай вну ўдзельнічалі таксама сем выкладчыкаў.

На абмеркаванне было вынесена тры пытанні: методыка правядзення семінарскіх і практычных заняткаў па дзяржаўна-прававых дысцыплінах; аб сувязях кафедр з практыкай; абмеркаванне навуковага даклада доктара юрыдычных навук А. А. Галаўко «Гарантыі забеспячэння прававой мясцовых Саветаў у галіне сельскай гаспадаркі».

Гаворачы пра супрацоўніцтва вучоных, загадчык кафедры Анатоль Аляксандравіч Галаўко падкрэсліў:

— У такой справе патрэбны энтузіясты.

Перш за ўсё ён меў на ўвазе дацэнтаў А. Ц. Лейзерава, Я. М. Тагупова. Плённы ўдзел прымаюць у гэтай справе прафесар С. Р. Віхараў, кандыдаты юрыдычных навук М. Ф. Сцепанко, А. М. Крамнік, выкладчык П. Я. Грынкін.

У планах навуковага і творчага супрацоўніцтва дзвюх кафедр намечана сумеснае абмеркаванне манаграфій, дысертацый і правядзенне шэрагу іншых узаемна карысных мерапрыемстваў.

У. СЯРЭБРАНІКАЎ.

Ужо многа год паміж калектывамі нашага універсітэта і Вільнюскага універсітэта імя В. Капсукаса існуюць традыцыйныя і рознабаковыя сувязі. Сяброўцы паміж сабой вучоныя, сустракаюцца на канферэнцыях студэнты, арганізуюцца то ў Мінску, то ў Вільнюсе спартыўныя сустрэчы, выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці.

А нядаўна вузы сяброўства двух універсітэтаў былі замацаваны дагаворам аб дружбе і супрацоўніцтве.

У Вільнюс для падпісання дагавору выязджалі рэктар БДУ прафесар У. М. Сікорскі, сакратар парткома Т. Я. Дударава, сакратар камітэта камсамола У. А. Навумовіч, старшыня прафкома А. М. Жылінскі, прадстаўнікі калектываў мастацкай самадзейнасці.

У Вільнюсе пасланцоў Беларускага універсітэта цёпла віталі літоўскія сябры.

У адпаведнасці з дагаворам універсітэты-партнёры будуць пастаянна абменьвацца інфармацыяй аб стане вучэбна-метадычнай работы, запрашэннямі на сімпозіумы і канферэнцыі, а таксама запрашэннямі вучоных для чытання лекцый.

У галіне навуковага супрацоўніцтва плануюцца, акрамя інфармавання аб напрамках навуковых пошукаў, сумесныя даследаванні.

Універсітэты будуць абменьвацца дэлегацыямі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных работнікаў і актывістаў, членаў СНТ, фотавыстаўкамі аб жыцці калектываў абодвух універсітэтаў, прадстаўнікамі спартыўных і мастацкіх калектываў, студэнцкімі будаўнічымі атрадамі.

Штогод прадстаўнікі рэктаратаў універсітэтаў будуць сустракацца для падпісання пратаколаў аб выніках супрацоўніцтва і планавання сумесных мерапрыемстваў на будучы год.

Наш. кар.

16 чэрвеня — выбары ў Вярхоўны Савет СССР

КЛОПАТЫ АГІТПУНКТА

Набліжаецца важная падзея ў жыцці нашай краіны — выбары ў Вярхоўны Савет СССР. І з кожным днём усё больш актыўна вядзецца падрыхтоўчая работа.

У агітпункце выбарчага ўчастка № 138/75, што знаходзіцца ў будынку юрыдычнага факультэта, усё падпарадкавана адной мэце —даць выбаршчыку максімум неабходных звестак. Хочаш азнаёміцца з «Палажэннем аб выбарах»? Калі ласка. На стале, засланым чырвоным абрусам, брашуры да выбараў, а таксама свежыя газеты і часопісы. На самым відным месцы — партрэты і біяграфіі кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР А. А. Грамыкі і У. А. Ляпёшкіна. На сценах — маляўнічыя плакаты; над іх афармленнем добра папрацавала студэнтка II курса фізфака Лапчук.

Да агітацыйнай дзейнасці прыцягнуты многія выкладчыкі, супрацоўнікі і лепшыя студэнты фізічнага факультэта.

Ад добрасумленнасці агітатараў залежыць вельмі многае. Старшы агітатар Міхаіл Лявонцьевіч Барздоў расказвае:

— Нашым асноўным клопатам было ў тэрмін, як гэтага патрабуе «Палажэнне аб выбарах», скласці спісы выбаршчыкаў, што даволі складана. Мы праводзім агітацыйную работу ў 106-кватэрным доме № 1 па вуліцы Кірава. Жывуць там у асноўным чыгуначнікі, якія па роду сваіх заняткаў часта бываюць у раз'ездах. Таму нашым агітатарам не раз даводзілася наведвацца да іх. Асабліва чула адносяцца агітатары да ветэранаў працы і вайны, бяруць на ўлік хворых — выбарчыя урны будуць дастаўлены да іх на кватэру.

Памочнікі ў Міхаіла Лявонцьевіча добрыя. Студэнт другога курса фізфака, выдатнік і актывіст Міхаіл Цёмкін, яго аднакурснік Яўген Рэзнікаў, трэцякурснік Мікалай Аўраменка і іншыя добрасумленна адносяцца да свайго грамадскага даручэння. Яны карпатліва складалі спісы, праводзілі з выбаршчыкамі гутаркі аб дэмакратызме савецкай выбарчай сістэмы, аб яе перавазе над сістэмай выбараў у краінах капіталу.

З 18 да 22 гадзін дзяжураць агітатары ў агітпункце. Яны гасцінна сустракаюць наведвальнікаў. Усе пажаданні і прапановы выбаршчыкаў акуратна занатоўваюцца ў спецыяльную кнігу, каб прыняць па іх адпаведныя захады.

Тыя, хто пажадае атрымаць кваліфікаваную юрыдычную кансультацыю, могуць звярнуцца да кандыдатаў навук, дацэнтаў К. А. Барзова, Е. А. Ануфрыева, А. Н. Раманковіча.

Юнакі і дзяўчаты, якім споўнілася ў гэтым годзе васемнаццаць, чакаюць 16 чэрвеня з асаблівым захапленнем. Яны ўпершыню аддадуць свае галасы за кандыдатаў народа. Гэты дзень стане для іх адным з самых знамянальных у жыцці.

В. КАДУШКА,
Н. ІЛЬІНА.





ФОТАРЭПАРТАЖ

СЁННЯ ТЫ ЯШЧЭ СТУДЭНТ...

НА ЗДЫМКАХ Д. Чаховіча:

● Ідзе абарона дыпломных работ у пяцікурснікаў біялагічнага факультэта.

● Георгій **Абакумаў** выбраў для спецыялізацыі ахову прыроды. Яго дыпломная работа прысвечана вывучэнню грызуноў Бярэзінскага запаведніка.

● Дзяржаўная камісія.

ВОПЫТ, ВАРТЫ ЎВАГІ

У групе народнага кантролю біяфака працуе 13 чалавек на чале са старшым навуковым супрацоўнікам А. І. Сцефановічам. ГНК кіруецца планам, які складзен на год і зацверджан на пасяджэнні партбюро факультэта. На аснове агульнага плана распрацаван канкрэтны план пасяджэнняў. Уся дзейнасць кантралёраў сканцэнтравана на пытаннях вучэбна-вытворчай, метадычнай і навукова-даследчай работы, адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасці і матэрыяльна-бытавога забеспячэння.

У саставе групы арганізаваны чатыры сектары: арганізацыі работы і галоснасці, вучэбна-вытворчай работы, навукова-даследчай работы, быту і аховы сацыялістычнай маёмасці. Усе члены ГНК маюць пастаянныя даручэнні і перыядычна прыцягваюцца да выканання сумесных праверак і рэйдаў.

Трэба сказаць, што ГНК біяфака адразу ж актыўна ўключылася ў работу: праведзен шэраг праверак; пасля абмеркавання вынікаў прыняты адпаведныя пастановы. Так, у студзені ГНК дэталёва вывучыла праект раскладу заняткаў на II семестр і знайшла шэраг недахопаў (тыднёвая перагрузка студэнтаў, наяўнасць «фортачак»). Прэтэнзіі ГНК былі выказаны дэканату, выяўленыя недахопы па магчымасці ліквідаваны.

Вывучана наведванне студэнтамі заняткаў па грамадскіх дысцыплінах. ГНК праверыла таксама, як супрацоўнікі факультэта прытрымліваюцца распарадку працоўнага дня.

Дзесяць праверак у студзені — лютым паказалі, што вучэбна-дапаможны персанал у асноўным прытрымліваецца працоўнага рэжыму. Аднак былі выяўлены і асобныя выпадкі спазнення супрацоўнікаў на работу. Гэтыя звесткі былі вывешаны для ўсеагульнага агляду, даведзены да ведама адміністрацыі факультэта.

Народныя кантралёры праверылі забяспечанасць студэнтаў інтэрнатам, работу сталовай, стан журналаў уліку рабочага часу.

Група народнага кантролю падтрымлівае пастаянны кантакт з дэканатам, партыйным бюро, камітэтам камсамола. Неабходна падкрэсліць, што тут наладжаны цесныя сувязі з «Камсамольскім пражэктарам», чаго, на жаль, няма ў іншых групах народнага кантролю.

Вельмі добра пастаўлена ў гэтай групе галоснасць. Ёсць на факультэце стэнд, на якім вывешваюцца матэрыялы групы: спіс членаў ГНК, план работы, пастановы, вынікі праверак, рэйдаў. Побач размяшчаецца стэнд «КП». Аб рабоце ГНК паведамлялася ў факультэцкім насценным друку, ва універсітэцкай шматтыражцы.

Вопыт работы групы народнага кантролю біялагічнага факультэта заслугоўвае ўвагі ўсіх груп народнага кантролю БДУ.

А. АКІНЧЫЦ,
намеснік старшыні універсітэцкай групы народнага кантролю.

Старшы навуковы супрацоўнік біялагічнага факультэта, кандыдат біялагічных навук **А. І. Сцефановіч** актыўна ўдзельнічае ў рабоце народнага кантролю універсітэта.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

Народны кантроль

ПРАВЕРКА ПАКАЗАЛА

Адна з праверак групы народнага кантролю БДУ мела сваёй мэтай высветліць, наколькі правільна назначаны стыпендыі студэнтам геаграфічнага, матэматычнага і гістарычнага факультэтаў.

У асноўным на факультэтах стыпендыя назначаецца правільна. У цяперашні час каля 70—72 працэнтаў студэнтаў атрымліваюць яе.

Факультэцкія стыпендыяльныя камісіі правялі вялікую работу па размеркаванню і назначэнню стыпендый, кіруючыся «Інструкцыяй аб парадку назначэння і выплаты стыпендыі студэнтам вышэйшых навучальных устаноў». Кіруючымі прынцыпамі пры назначэнні стыпендый служаць выдатная і добрая вучоба і актыўны ўдзел у грамадскай і навуковай рабоце.

Аднак неабходна звярнуць увагу па той факт, што стыпендыі на матэматычным і геаграфічным факультэтах назначаюцца значнай колькасці студэнтаў, якія атрымалі здавальняючыя адзнакі. Так, на геафаку стыпендыя назначана 104 студэнтам, якія маюць здавальняючыя адзнакі. Прычым не толькі адну, а нават тры—чатыры.

На матэматычным факультэце 33 першакурснікі з дзвюма здавальняючымі адзнакамі атрымліваюць стыпендыю, а трое — і з трыма.

З другога боку, на ўсіх праверaных факультэтах многія студэнты, якія атрымалі на экзаменах выдатныя адзнакі і прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці факультэтаў, не атрымліваюць павышаных стыпендый.

Відавочна, пытанне аб назначэнні стыпендый неабходна абмеркаваць усебакова і выпрацаваць згодна з інструкцыяй больш пэўныя крытэрыі.

М. КНІГА,
кіраўнік сектара быту ГНК БДУ.

У СТУДЭНЦКІМ ІНТЭРНАЦЕ

ІНТЭРНАТ № 1, дзе жывуць студэнты трох аддзяленняў гістарычнага факультэта: гісторыі, філасофіі і палітэканоміі, на працягу некалькіх год трымае першае месца сярод студэнцкіх інтэрнатаў БДУ па арганізацыі быту і парадку. Нягледзячы на тое, што ў ім пражывае некалькі соцень чалавек, там адчуваюцца абставіны дамашняй утульнасці. А ствараюць гэты «дамашні» стыль добрыя і любячыя сваю справу людзі. І перш за ўсё — камендант Надзея Сяргееўна Галіна. Яе па праву можна назваць маці і руплівай гаспадыняй вялікай студэнцкай сям'і. За чулыя і ўважлівыя адносіны, за дабрату і сардэчнасць студэнты плацяць ёй любоўю і павагай.

У сваёй нялёгкай працы камендант паўсядзённа абапіраецца на дапамогу студэнцкага савета, які з'яўляецца ініцыятарам многіх цікавых спраў. Вялікую ролю ў падтрыманні чысціні і парадку адыгрывае бытавая камісія студсавета, якую ўзначальвае студэнт І курса В. Сілін.

На добрым арганізацыйным узроўні вядзе свой участак работы савет ленінскага пакоя. Толькі за апошнія два месяцы ён правёў цэлы шэраг цікавых мерапрыемстваў, такіх, як вечар, прысвечаны 104-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, і вечар пытанняў і адказаў «Міжнародныя абставіны», лекцыя аб міжнародным становішчы, сустрэча з памочнікам пракурора рэспублікі І. П. Шаўчуком на тэму «Чалавек і закон», гутарка з урачом жаночай кансультацыі Л. І. Дубовік, шахматна-шашачны турнір, сустрэча з артыстамі Белдзяржфілармоніі і г. д.

Вялікі ўдзел у арганізацыі культурна-выхаваўчых мерапрыемстваў прымае студэнтка II курса Т. Ільіна. Савету ленінскага пакоя ва ўсіх яго пачынаннях дапамагаюць вопытныя выкладчыкі факультэта Б. А. Мельцар і Н. А. Ганчарова, зацверджаныя партыйным бюро ў якасці куратараў-выхавацеляў. І наогул стан спраў у інтэрнаце пастаянна знаходзіцца ў полі зроку дэканата і гістарычнага факультэта, партыйнага і прафсаюзнага бюро, групы народнага кантролю. Гэта па ініцыятыве дэканата і партыйнага бюро быў створан у інтэрнаце інстытут выхавацеляў (куратараў) для штодзённай дапамогі студэнтам у здзяйсненні грамадска-палітычнай і культурна-выхаваўчай работы.

У штодзённым жыцці дружнага студэнцкага калектыву многа цікавых спраў. І хацелася б, каб гэтыя справы часцей і шырэй знаходзілі сваё адлюстраванне ў насценным друку. На жаль, насценгазета «За наш быт» выходзіць нерэгулярна, а змест убачыўшых свет нумароў не нясе якой-небудзь значнай спецыфічнай інфармацыі. Студсавету інтэрната, а таксама выхавацелям трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на гэты ўчастак работы.

Групе народнага кантролю універсітэта, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі належыць большую ўвагу звярнуць на работу буфета ў інтэрнаце. Недапушчальна бедны там асартымент. Не пашкодзіла б увесці ў меню больш недарагіх, разнастайных страў.

Стандартны рацыён, прыняты ў буфеце інтэрната № 1, патрабуе сур'ёзнага і зацікаўленага перагляду.

І. ЛІТВІНОЎСКІ,
старшыня ГНК гістарычнага факультэта.

Таня **Шаўцова** — адна з многіх народных кантралёраў БДУ — апрацоўвае даныя праверкі медыцынскага абслугоўвання ў інтэрнатах.

Лепшым у інтэрнаце № 1 лічыцца санпост, у які ўваходзяць студэнткі II курса аддзялення філасофіі гістфака Іна **Доўнар**, Людміла **Шульга** і Валянціна **Шавыркіна**.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

ХОЧАМ БЫЦЬ НАСТАЎНІКАМІ

Ужо чацвёрты год ва універсітэце працуюць грамадскія падрыхтоўчыя курсы. Яны дапамагаюць моладзі, што працуе на вытворчасці, падрыхтавацца да ўступных экзаменаў у вну. Зараз на ГПК займаецца каля 500 чалавек.

Курсы працуюць па сістэме вячэрняга навучання. Выкладанне вядуць старшакурснікі, супрацоўнікі і аспіранты БДУ, студэнты інстытута замежных моў. На працягу ўсяго навучальнага года тут працавалі дацэнт М. Д. Рафальскі, аспірант А. Е. Піскуноў.

Вялікую карысць даюць курсы не толькі слухачам, але і студэнтам-выкладчыкам. Першыя набываюць неабходныя веды і прывыкаюць да тых форм заняткаў, якія існуюць у вну; другія набываюць навыкі педагагічнай работы, расце іх грамадская актыўнасць.

Л. СІДАРЭНКА.

На аддзяленні беларускай мовы і літаратуры падрыхтоўчых курсаў было прапанавана сачыненне на тэму: «Чаму я хачу стаць філолагам».

І вось як адказалі

Валянціна Малахоўская, староста групы, якая заўсёды акуратна наведвае заняткі і старанна рыхтуецца да іх:

— Працую я на Мінскім гадзіннікавым заводзе. Калі прыйшла туды ўпершыню, то было крыху страшна: «Не змагу, не здолею». Але ўсюды добрыя і чулыя людзі. Падтрымалі, падказалі, навучылі. Асвоіла адну са зборачных аперацый, на якой працую зараз. Спачатку было цяжка. Але прайшоў час, і я ўсё адолела. У 1971 годзе заваявала званне «Ударнік камуністычнай працы. І зараз імкнуся пацвярджаць яго старанная працай. У той жа год мяне выбралі прафгрупоргам брыгады. Клопатаў прыбавілася.

Але мяне не пакідае мара дзяцінства — стаць выкладчыцай.

— Я таксама хачу стаць настаўніцай, —піша **Валянціна Нарбутовіч.** —Хачу вучыць і выхоўваць дзяцей, як мой класны кіраўнік Лідзія Іванаўна.

Цяпер працую на швейнай фабрыцы імя Н. К. Крупскай. Прымаю актыўны ўдзел у жыцці прадпрыемства, з'яўляюся сакратаром камсамольскай арганізацыі цэха.

Валянціна Багрыцэвіч таксама працуе на швейнай фабрыцы імя Н. К. Крупскай.

— ...Шыюць па-моднаму нашы швеі, — піша яна.—І вось мне хочацца зрабіць штосьці добрае, прыемнае, каб можна было радавацца, што і твая праца, і ты сама патрэбны людзям. Гэта ж і ёсць вышэйшае шчасце.

Жыццё праходзіць цікава і хутка, але мара стаць настаўніцай не пакідае мяне і сёння. Я хачу вучыць дзяцей, адкрываць ім свет ведаў.

— Чаму я выбрала прафесію настаўніцы? — пытаецца **Святлана Ярашонак.**— Здаецца, адразу і не адкажаш.

Можа таму, што з дзяцінства прывыкла глядзець, як мая мама прыносіць дадому кожны дзень цэлыя стосы сшыткаў, а потым сядзіць над імі. Вось ужо 22 гады яна працуе з вучнямі пачатковых класаў. А можа таму, што літаратуру ў нас выкладалі сапраўдныя майстры сваёй справы Тамара Фёдараўна Саўчыц і Ганна Кузьмінічна Дубаневіч.

А, мабыць, я выбрала літаратуру таму, што вельмі люблю чытаць вершы. Не раз прыходзілася ездзіць у Вілейку на конкурс лепшых дэкламатараў вершаў пра Леніна.

— Настаўнік абавязан абудзіць у дзяцей высокае пачуццё грамадзяніна, прывіць адказнасць перад народам,— сцвярджае **Святлана Кісялёва,** кантралёр АТК вытворча-тэхнічнага аб'яднання «Інтэграл».

— Мой бацька скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію,— паведамляе **Наталля Небышынец.**— Ён з дзяцінства прывіў мне любоў да зямлі. І хацеў, каб я пасля заканчэння сярэдняй школы паступала ў акадэмію, набыла прафесію агранома, як і ён.

Але ў мяне была мара стаць настаўніцай.

...Як заканчвала школу, то мне здавалася, што я ўжо шмат чаго ведаю. Цяпер жа бачу, што памылялася. Хочацца вучыцца далей, пабольш чытаць, каб потым, калі стану настаўніцай, свае веды панесці дзецям, у тыя самыя мае Навасёлкі, што стаяць на маляўнічым беразе ракі Беразіны.

Ларыса Кухарава рыхтавалася паступаць на юрыдычны факультэт.

— З гэтай мэтай і прыйшла на падрыхтоўчыя курсы,— піша яна.— Рашыла, што замежную мову вывучу сама, а лекцыі па беларускай літаратуры не пашкодзяць. Але пасля першых заняткаў пераканалася, што на юрыдычны факультэт я ўжо не пайду, а хачу выкладаць родную мову і літаратуру.

В. КАЛАДЗІНСКІ.

Насустрач 30-годдзю вызвалення Беларусі

ГЕАФАК ПРЫМАЕ ГАСЦЕЙ

Мноства кветак упрыгожвае святочную сцэну актавай залы геафака. На ўсю сцяну раскінулася схема размяшчэння партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай зоны — перапляценне чорных і чырвоных ліній.

Зала поўная. У чаканні замерлі аператары з тэлестудыі.

Геафак прымае дарагіх гасцей — Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка, намесніка рэдактара часопіса «Камуніст Беларусі», былога падрыўніка М. В. Тараткевіча, народнага артыста БССР, былога франтавога аператара І. Н. Вайняровіча, Героя Савецкага Саюза, былога камісара Першай антыфашысцкай партызанскай брыгады І. М. Цімчука і яшчэ многіх ветэранаў — герояў, удзельнікаў тых падзей, што апісаны ў новай кнізе У. Е. Лабанка «Партызаны прымаюць бой».

У гэтай кнізе, як сказаў дацэнт філфака У. С. Карабан,— гісторыя барацьбы народа, праўда жыцця.

Але сёння ветэраны і студэнты, выкладчыкі БДУ сабраліся не толькі дзеля таго, каб пагутарыць аб творы У. Е. Лабанка. Сёння ў іх дзень успамінаў, дзень памяці загінуўшых, дзень праслаўлення мужнасці і прыгажосці душы савецкага чалавека.

— Толькі цяпер, праз трыццаць год, мы можам адчуць веліч нашай былой справы, — зала слухае кінарэжысёра і аператара І. Н. Вайняровіча.— Як жа так атрымалася, што 17 тысяч партызан змаглі выстаяць супраць 60 тысяч карацеляў?

— Мабыць, маладым, што сядзяць сёння ў гэтай зале, такое пакажацца немагчымым,— працягвае доктар медыцынскіх навук, прафесар, былы партызан В. В. Гарбачоў. — Але на вайне няма падзелу на магчымае і немагчымае, ёсць толькі адно — трэба.

Ніколі не забыць былым партызанам тых узгоркаў, лясоў і сцежак Ушацкага раёна, дзе давялося ім біцца з ворагам. Яны расказвалі так, што кожны са студэнтаў нібыта сам пабываў на гэтых узгорках, сам прабіраўся ўздоўж калючага дроту з гранатай у руцэ.

Н. Шатрова, А. Шкарупа, Т. Тачоная і іншыя студэнты геафака падзяліліся сваімі ўражаннямі, хваляваннямі, развагамі.

— Героі заўсёды будуць жыць у нашых сэрцах,— чулі госці сардэчныя словы камсамолкі Л. Барушкі. — Дзякуй, вялікае дзякуй вам за тое, што вы зрабілі для нас. Мы гэтага ніколі не забудзем!

І зноў, як і пры сустрэчы, кветкі. Моладзь паднесла іх ветэранам у знак удзячнасці і глыбокай пашаны, пакланення іх стойкасці.

С. УСЦІНОВІЧ.

ВЕТЭРАНЫ Ў СТРАІ

Іх галасы гучаць у студэнцкіх аўдыторыях і ў ленінскіх пакоях інтэрнатаў. Яны ўдзельнічаюць разам з моладдзю ў паходах па месцах баявой славы і ускладаюць кветкі да магіл загінуўшых герояў, успамінаюць свае ваенныя шляхі і дзеляцца з юнакамі і дзяўчатамі сваім душэўным багаццем і мудрасцю. Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны...

Ва універсітэце зараз працуе 359 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны: 47 з іх — абаронцы Масквы, 36 — Ленінграда, 28 — Сталінграда, Каўказа, Адэсы і іншых гарадоў і населеных пунктаў Радзімы, 34 удзельнічалі ў вызваленні Варшавы, 14 — Прагі, 39 — ва ўзяцці Кенігсберга, 34 — Берліна.

Гэтыя лічбы прагучалі на канферэнцыі універсітэцкай арганізацыі ветэранаў вайны, якая адбылася на мінулым тыдні. З дакладам аб ваенна-патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі і ўдзеле ў ім ветэранаў выступіў сакратар савета ветэранаў М. І. Аносаў.

У справаздачным перыядзе, з 1972 па 1974 год, ветэраны вайны прачыталі 1150 дакладаў і лекцый на факультэтах, кафедрах, у заводскіх калектывах, у падшэфных воінскіх часцях і ў школах. Добра была пастаўлена патрыятычная работа на фізічным факультэце (старшыня секцыі М. Д. Марэнка), геаграфічным (У. А. Навіцкі, Н. П. Козыр), факультэце журналістыкі (Г. З. Бягун), юрыдычным (Е. Ф. Плюто), гістарычным (Ю. І. Драгун), ваеннай кафедры (М. Т. Рудчанка, І. Я. Петчанка).

Ва універсітэцкай бібліятэцы актыўна вядзе работу па арганізацыі канферэнцый чытачоў па кнігах ваенных мемуараў, аб партызанах і падпольшчыках А. М. Рукшын.

Многія студэнты гістарычнага, філалагічнага факультэтаў, факультэта журналістыкі рыхтуюць па ваенна-патрыятычнай тэматыцы навуковыя даклады, курсавыя і дыпломныя работы.

За апошнія два гады ва універсітэце праведзена 65 тэматычных вечароў, 297 сустрэч з Героямі Савецкага Саюза, Героямі Сацыялістычнай Працы, ветэранамі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў; 3600 студэнтаў удзельнічалі ў 40 спаборніцтвах па ваенна-прыкладных відах спорту.

Важную ролю ва ўдасканаленні абаронна-масавай работы сталі адыгрываць факультэцкія секцыі універсітэцкай арганізацыі ДТСААФ. За дасягнутыя поспехі арганізацыя ДТСААФ БДУ ўзнагароджана Граматай і Ганаровым знакам ЦК ДТСААФ СССР, Граматай ЦК ДТСААФ БССР.

Актыўна ўдзельнічаюць ветэраны ў арганізацыі фестываляў ваенна-патрыятычных фільмаў, разнастайных экскурсій, шэфскай работы, святкаванні знамянальных дат.

Пытанні ваенна-патрыятычнага выхавання і абаронна-масавай работы сярод студэнтаў і супрацоўнікаў сталі часцей абмяркоўвацца на пасяджэннях парткома. Пры партыйным камітэце паспяхова дзейнічае сектар ваенна-патрыятычнага выхавання. Ён арганізуе і каардынуе ваенна-патрыятычную работу.

М. І. Аносаў спыніўся на задачах універсітэцкай арганізацыі ветэранаў у перыяд падрыхтоўкі да 30-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 30-годдзя заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Дэлегаты канферэнцыі тт. Андрух, Рукшын, Марэнка, Бягун, Гарлатаў, Мізрахі расказалі аб плённай і разнабаковай выхаваўчай рабоце, якая праводзіцца ў розных універсітэцкіх падраздзяленнях, аб падрыхтоўцы да 30-годдзя вызвалення Беларусі. Так, супрацоўнікі бібліятэкі ў садружнасці з многімі кафедрамі арганізуюць тэматычныя агляды літаратуры, рыхтуюць канферэнцыі «Дзеля жыцця на зямлі», кніжныя выстаўкі «Подзвігу 30 год» і г. д.

У Дзень Перамогі вялікая група студэнтаў і супрацоўнікаў фізфака выязджала ў падшэфную воінскую часць. Былі праведзены спартыўныя спаборніцтвы, дадзен вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. У гэты ж дзень турысцкія атрады прайшлі па дарогах баявой славы.

Да знамянальнай даты ў фізічным корпусе ствараецца вялікая выстаўка.

На журфаку ўвайшлі ў практыку выпускі спецыяльных нумароў вучэбнай газеты «Журналіст», прысвечаныя подзвігам партызан і падпольшчыкаў. Рыхтуюцца тэматычныя тэлевізійныя перадачы, адбудуцца сустрэчы з былымі падпольшчыкамі.

Да свята вызвалення на факультэтах абнаўляюцца стэнды, рыхтуюцца выпускі насценных газет, лекцыі, гутаркі.

М. МАЦЕЙКА.

НАША ГРУПА

Прайшоў амаль год з той пары, як мы разам. Мы — гэта 12 студэнтаў біялагічнага факультэта кафедры сістэматыкі раслін. Мы ўсе вельмі розныя па сваіх поглядах і інтарэсах, але нас аб'яднала агульнае імкненне даведацца як мага больш аб раслінным царстве — ад прасцейшых мікраскапічных водарасцяў да высокаарганізаваных раслін, вывучыць гэта царства і зрабіць яго яшчэ багацейшым і прыгажэйшым.

Кожны з нас сам выбраў тэму для сваіх даследаванняў. Так, напрыклад, наш камсорг Тоня Баброўская займаецца вывучэннем меданоснасці ліп, Рая Тышкевіч і Рая Траццякова, пачынаючы з першага курса, праводзяць даследаванні з лекавымі раслінамі. Бываючы ў экспедыцыях, дзяўчаты вызначаюць запасы лекавых раслін у Беларусі. У час летняй экспедыцыі сабраў неабходныя даныя і Валодзя Аўчыннікаў. Ён выступіў на навуковай канферэнцыі з дакладам на тэму «Геабатанічная характарыстыка фітацэнозаў Салігорскага раёна, годных для нарыхтоўкі лекавых раслін» і быў адзначан граматай. Не адстаюць ад іх і астатнія. Яны вывучаюць састаў флоры БССР, даследуюць хваробы раслін і сродкі барацьбы з імі. А ўсе разам мы дапамагаем у рабоце вопытнай гаспадарцы універсітэта.

Нашы рабяты — актыўныя ўдзельнікі грамадскага жыцця факультэта. Саша Вадэйка з'яўляецца членам камітэта камсамола, Валодзя Аўчыннікаў і Вася Барысёнак — заўзятыя спартсмены.

А яшчэ ў нас цудоўны куратар — Анатоль Тарасавіч Федарук. Ён дапамагае нам і добрай усмешкай, і парадай. Без яго ў групе не праходзіць ні адно мерапрыемства.

Цяпер цяжка сказаць, кім мы станем,—вучонымі, настаўнікамі, але галоўнае, каб захавалася гэтая мэтанакіраванасць і вялікая дружба.

В. ПІСКУНОЎ,
С. ПІСКУНОВА,
студэнты III курса біяфака.

ГАЛОЎНАЕ — ЗАЦІКАВІЦЬ СТУДЭНТА

Вынікі экзаменаў часта залежаць ад таго, як праводзіліся практычныя заняткі. Напярэдадні сесіі мы вырашылі пагутарыць з асістэнтам кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Э. М. Белкінай.

— Эла Міхайлаўна, Вы вядзеце практычныя заняткі па курсу дыялектычнага матэрыялізму ўжо два гады. Якія цяжкасці, праблемы паўставалі перад Вамі за гэты час?

— Бадай, найпершае пытанне, якое павінен вырашыць выкладчык, гэта — як знайсці неабходны кантакт са студэнтамі.

Вось я ўпершыню ўваходжу ў аўдыторыю. І толькі ад мяне ў гэты час залежыць, ці будуць заняткі цікавымі, ці пасябруем мы. Вырашэнне праблемы кантакту прымусіла мяне не толькі займацца аналізам студэнцкай аўдыторыі, але і падысці да яе з улікам спецыфікі факультэтаў.

Я праводзіла практычныя заняткі ў журналістаў, хімікаў, філолагаў. Усюды неабходна было ўсвядоміць асаблівасці прафесіі маіх падапечных. У гутарцы, напрыклад, са студэнтамі-хімікамі аб формах існавання матэрыі і іншых пытаннях дыямата мы карысталіся прыкладамі з арганічнай і неарганічнай хіміі; філолагаў і журналістаў больш за ўсё зацікавіла ленінская тэорыя адлюстравання — тут мы шмат гаварылі аб літаратуры і мастацтве.

— Значыць, Вы лічыце, што галоўнае ў Вашай справе...

— ...Галоўнае — зацікавіць студэнта, захапіць яго, прымусіць думаць самастойна.

Памятаю, гарачая дыскусія разгарэлася па праблеме пазнавальнасці свету ў другой групе II курса факультэта журналістыкі. Мне было прыемна слухаць асабістыя меркаванні па гэтай тэме студэнтаў Г. Марозава, У. Лялекі, А. Кастрыкіна і многіх іншых, прыемна было нават спрачацца з імі. На практычных занятках былі закрануты і пытанні паходжання жыцця на зямлі, увогуле узнікнення самой планеты, праблемы існавання разумных істот у сусвеце. Яны цесна звязаны з праграмай, хоць і выходзяць за рамкі падручніка. Парадавалі мяне журналісты — у іх адказах адчувалася сапраўдная зацікаўленасць, прага ведаць матэрыял глыбей. Філолагі больш прытрымліваліся літары падручніка, але і ў іх ёсць вельмі дапытлівыя людзі.

— Якія ж сродкі выкарыстоўваліся Вамі для дасягнення мэты — зацікавіць студэнта?

— Вельмі плённай была сістэма тэматычных дакладаў. Навуковыя работы на II курсе ў чацвёртай групе аддзялення рускай мовы і літаратуры філфака пісалі М. Ціцянкоў, Г. Сяўрук, М. Шчарбакова. Акрамя апытвання, добрай формай праверкі якасці ведаў з'яўляюцца кантрольныя работы. У іх бачна сістэма мыслення студэнта, яго логіка.

Неабходна шырэй выкарыстоўваць на практычных занятках і тэхнічныя сродкі — магнітафон, кінапраектар.

Гутарку запісала
С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

СПРАВЫ ВУЧЭБНЫЯ

Чацвёртакурснікі Галя **Ягорава** і Тома **Шалухіна**— актыўныя ўдзельнікі СНТ хімічнага факультэта.

Вольга **Радчук** і в'етнамская студэнтка Нгуен Бак **Кінь** жывуць у інтэрнаце. У іх стала правілам рыхтавацца да экзаменаў разам.

Фота **П. Грабенчука.**

ЧЭРВЕНЬСКІ КАЛЯНДАР

1 чэрвеня — Міжнародны дзень абароны дзяцей.

3 чэрвеня — 30 год назад (1944) нямецка-фашысцкія акупанты спалілі літоўскую вёску Пірчупіс.

6 чэрвеня — 175 год з дня нараджэння А. С. Пушкіна (1799—1837).

7 чэрвеня 1971 г. — Створана першая ў свеце савецкая арбітальная пілатуемая навуковая станцыя «Салют» шляхам стыкоўкі станцыі «Салют» і транспартнага карабля «Саюз-11». Палёт станцыі, пілатуемай экіпажам у саставе касманаўтаў Г. Т. Дабравольскага, В. М. Волкава і У. І. Пацаева, прадаўжаўся на працягу 24 сутак.

9 чэрвеня — Дзень работнікаў лёгкай прамысловасці.

16 чэрвеня — Дзень медыцынскага работніка.

17 чэрвеня—50 год з дня адкрыцця (1924) V канграса Камінтэрна.

16—19 чэрвеня 1963 г. — Першая ў свеце жанчына-касманаўт В. У. Церашкова здзейсніла на караблі «Усход-6» касмічны палёт сумесна з караблём «Усход-5», пілатуемым В. Ф. Быкоўскім.

22 чэрвеня 1941 г. — Вераломны напад фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза супраць фашысцкай Германіі.

25 чэрвеня — 30 год з дня гібелі Ю. В. Смірнова (1925—1944), гвардыі радавога, Героя Савецкага Саюза.

30 чэрвеня — Дзень савецкай моладзі.

1 чэрвеня — Міжнародны дзень абароны дзяцей

Самы прывілеяваны клас у нашай краіне — гэта дзеці. Для іх будуюцца цудоўныя школы і палацы піянераў, аб іх здароўі, адпачынку, навучанні паўсядзённа клапоціцца Радзіма.

ШЭФСКІ КАНЦЭРТ

Па ўсёй краіне прагучаў апошні школьны званок для дзесяцікласнікаў. Адгукнуўся ён і ва універсітэцкіх аўдыторыях, бо студэнты — шэфы школьнікаў са Стаўбцоўскага раёна. На раённы злёт дзесяцікласнікаў, які праходзіў на радзіме Я. Коласа, была накіравана агітбрыгада БДУ ў складзе вакальна-інструментальнага ансамбля «Квазары» і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці юрфака і факультэта журналістыкі.

З прывітальным словам да школьнікаў звярнуўся старшыня прафкома універсітэта А. М. Жылінскі. Ён расказаў рабятам аб жыцці нашай вну. А затым студэнты далі канцэрт, у якім прыняў таксама ўдзел заслужаны артыст рэспублікі Віктар Рыгоравіч Сінайскі.

На адкрытай пляцоўцы, дзе сабралася каля тысячы ўдзельнікаў злёту, гучалі папулярныя песні савецкіх і замежных аўтараў, а таксама песні, напісаныя самімі студэнтамі. Рабяты доўга не хацелі адпускаць са сцэны ўдзельнікаў агітбрыгады.

В. ПУЧЫНСКІ,
студэнт.

ПА-НОВАМУ ЎБАЧЫЦЬ СВЕТ

Маляўнічая аб'ява, што вісіць на геафаку, паведамляе: «Кожнага, хто мае адносіны да нашага факультэта, запрашаем прыняць удзел у фотавыстаўцы». Геафакаўцы прадаўжаюць добрую традыцыю.

Першая выстаўка была арганізавана зімой у мінулым годзе. Малодшы навуковы супрацоўнік кафедры возеразнаўства А. А. Серафімовіч, загадчык вучэбнай лабараторыі возеразнаўства Б. П. Уласаў і старшы выкладчык кафедры геадэзіі і картаграфіі А. А. Бяспалы выступілі тады ініцыятарамі гэтай справы. Арганізатарам яе быў камітэт камсамола факультэта. Фотавыстаўка атрымалася добрай, хоць і не ўсе фотаздымкі, якія былі змешчаны на ёй, мелі высокую якасць, і яе ўдзельнікамі былі толькі 13 супрацоўнікаў геафака. Яна мела поспех: пасля адкрыцця выстаўкі студэнты геафака горача спрачаліся наконт змешчаных фотаздымкаў, выказвалі свае меркаванні, даслалі ў адрас аргкамітэта выстаўкі многа водгукаў, у якіх выказвалі свае пажаданні, парады. Стала ясна, што пачатак пакладзен.

І вось камітэт камсамола факультэта арганізоўвае другую фотавыстаўку.

Тэматыка будучых работ разнастайная. Гледачы ўбачаць зафіксаваныя цікаўным вокам фотаапарата новабудоўлі, усенароднае святкаванне знамянальных дат, камсамольскія будні, спартыўныя падзеі, а таксама краявіды роднай Беларусі.

Фотавыстаўка павінна дапамагчы гледачу паглядзець новаму ўбачыць свет і людзей, акружаючых яго, у самым звычайным знайсці незвычайнае, цікавае і прыгожае.

Было б вельмі добра, калі б і на іншых факультэтах часцей арганізоўвалі агляды фотаработ, прыцягвалі да іх і выкладчыкаў, і супрацоўнікаў, і студэнтаў. Тым больш, што фотаматэрыялаў у нас многа.

А. СУЛКОЎСКАЯ.

НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

У 1974 годзе ў выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна выйшлі наступныя кнігі:

1. ПАДРУЧНІКІ І ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ:

ЖУКАЎ Н. І. Філасофскія асновы кібернетыкі. Выданне 2-е, папраўленае і дапоўненае. На рускай мове. 206 с. Цана 52 к.

У рабоце даюцца агульнатэарэтычныя, метадалагічныя, лагічныя і прыродазнаўча-навуковыя асновы кібернетыкі, паказана цесная сувязь з агульнай тэорыяй сістэм, роля кібернетычных паняццяў у рашэнні шэрагу праблем сучаснай навукі. У канцы кожнага раздзела кнігі дадзен спіс неабходнай літаратуры. У дадатку прапануецца пералік тэм для семінарскіх заняткаў, курсавых і дыпломных работ.

Вучэбны дапаможнік разлічан на студэнтаў філасофскіх аддзяленняў і выкладчыкаў вну. Даступнасць выказанага дазваляе рэкамендаваць яго таксама і слухачам метадычных семінараў па адпаведнай праблематыцы.

КАЛЕКТЫЎ АЎТАРАЎ. Зарубежная літаратура. Выданне 2-е. На рускай мове. 463. Цана 1 р. 07 к.

Дапаможнік прадстаўляе сабой кароткі выклад курса гісторыі зарубежных літаратур да 1917 года. У ім даецца характарыстыка важнейшых гісторыка-літаратурных з'яў, разглядаецца творчасць майстроў сусветнай літаратуры.

Можа быць выкарыстан выкладчыкамі і студэнтамі філалагічных факультэтаў, а таксама выкладчыкамі сярэдніх школ.

СТРАЛЬЦОЎ Б. В. Аналітычныя жанры [пытанні тэорыі і практыкі]. На беларускай мове. 134 с. Цана 27 к.

У прапанаванай чытачу кнізе падрабязна разглядаюцца праблемы развіцця сучаснага стану жанраў: карэспандэнцыі, артыкула і рэцэнзіі, іх узаемадзеянне з іншымі жанрамі, аналізуюцца новыя жанравыя формы, народжаныя газетнай практыкай. У першую чаргу асвятляюцца не распрацаваныя ў журналісцкай літаратуры аспекты функцыяніравання аналітычных жанраў.

Кніга адрасавана выкладчыкам і студэнтам, супрацоўнікам рэдакцый газет і часопісаў.

ЗАДЗІРАКА А. А. Дапаможнік па нямецкай мове для фізікаў і радыёфізікаў. На нямецкай мове. 160 с. Цана 42 к.

Гэты зборнік тэкстаў на нямецкай мове з'яўляецца дапаможнікам для аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў студэнтаў, а таксама для аспірантаў, якія працуюць над удасканаленнем навыкаў перакладу і рэферыравання (без слоўніка) арыгінальнай тэхнічнай літаратуры па фізіцы і радыёфізіцы.

Асноўная мэта дапаможніка — падрыхтаваць студэнтаў да бесперакладнага разумення арыгінальнай літаратуры і навучыць іх весці элементарную гутарку на нямецкай мове па спецыяльнасці.

БОЎБЕЛЬ Е. І., ДАНЕЙКА І. К., ІЗОХ В. В. Элементы тэорыі інфармацыі. На рускай мове, 112 с. Цана 21 к.

У кнізе паслядоўна разглядаюцца асноўныя палажэнні тэорыі інфармацыі, апісваюцца крыніцы дыскрэтных паведамленняў, дыскрэтныя і безупынныя каналы з шумамі, разглядаюцца праблемы кадзіравання. Асноўныя палажэнні тэорыі інфармацыі праілюстраваны вялікай колькасцю прыкладаў і задач, якія дапамогуць глыбей зразумець выкладзены матэрыял.

Кніга прызначана для студэнтаў фізічных факультэтаў. Яна можа быць карыснай і для студэнтаў электратэхнічных інстытутаў сувязі і радыётэхнічных інстытутаў. Гэта кніга рэкамендуецца таксама для самастойнага знаёмства з асновамі тэорыі інфармацыі.

ГУСАК А. А. Элементы метадаў вылічэнняў. На рускай мове. 168 с. Цана 24 к.

Кніга прысвечана важным пытанням вылічальнай матэматыкі і матэматычнай апрацоўкі вынікаў доследаў. У ёй знаходзяцца неабходныя тэарэтычныя звесткі к рашэнню алгебраічных і трансцэндэнтных ураўненняў, сістэм лінейных алгебраічных ураўненняў, прыбліжанаму вылічэнню пэўных інтэгралаў, вызначэнню параметраў эмпірычных формул, інтэрпаліраванню функцый, лічбаваму рашэнню звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў. Прыводзяцца прыклады рашэння задач, задачы і практыкаванні для самастойнай работы.

Вучэбны дапаможнік прызначан для студэнтаў тэхнічных вну, хімічных і геалагічных спецыяльнасцей універсітэтаў. Можа быць выкарыстан у сярэдніх школах для гуртковай работы па матэматыцы.

КАЛЕКТЫЎ АЎТАРАЎ. Палявая і лабараторная практыка па глебазнаўству. Пад рэд. А. Г. Мядзведзева. На рускай мове. 966 с. Цана 35 к.

Кніга прадстаўляе сабой вучэбны дапаможнік для студэнтаў геаграфічных і біялагічных спецыяльнасцей універсітэтаў і пединстытутаў. У ёй апісваецца змест і методыка правядзення палявой вучэбнай практыкі па глебазнаўству ва ўмовах Беларусі, выкладаюцца лабараторныя метады даследавання глебаў, складання глебавых карт і агрохімічных картаграм з указаннем іх прызначэння і спосабаў прымянення. Шмат увагі ўдзяляецца тэхніцы правядзення палявых і лабараторных даследаванняў. У кнізе знайшлі адлюстраванне пытанні выкарыстання аэрафотаматэрыялаў пры палявым даследаванні і карціраванні глеб, а таксама пытанні ўзаемасувязі глебавага покрыву з іншымі кампанентамі ландшафта.

ДЗЯКУЙ ЗЯЛЁНАМУ ЛЕСУ

...Дарога ўецца між хвой. Сёння ў нас калектыўны паход у лес, сёння наша група сабралася адпачыць.

Пакуль сонейка яшчэ высока, гуляем у футбол. Не бяда, што амаль ніхто не ўмее добра ганяць мяч, затое ўсім цікава.

Прыемна адчуць на сухіх пасля гульні вуснах салодкі смак печанай бульбы. Добра ляжаць тварам да шапак чорна-медных соснаў і бачыць, як, нібыта шатром, змыкаюцца яны над табой у вышыні.

А хіба можна, едучы ў лес, пакінуць дома песню? Рэпертуар самы разнастайны: ад роднай сэрцу «Купалінкі» да вечнага і неўміручага «Гаудэамуса».

Ля кастра мы не толькі спевакі, але і паэты. Хто тут чытае вершы? Ты? Няўжо сам напісаў? А я нават не ведаў, што ты вершы складаць такі мастак.

Што за бяда, калі трэба ісці за тры кіламетры да бліжэйшай станцыі, каб не застацца начаваць у лесе. Што за бяда, калі падае на зямлю цёплы майскі дождж. Лес пакідае нам добры настрой на многа дзён — той святочны настрой, які дапаможа адолець надыходзячую сесію. **А. ЦЫГУЛЁЎ,**
студэнт.

ЗАПРАШАЕ «НАРАЧ»

Летам спартыўна-аздараўленчы лагер «Нарач» будзе працаваць у тры змены — з 1 ліпеня па 27 жніўня:

I — з 1 па 20 ліпеня;
II — з 20 ліпеня па 8 жніўня;
III — з 8 па 27 жніўня.

Аб сваім жаданні паехаць у лагер неабходна паведаміць у прафбюро факультэта.

УВАГА! КОНКУРСЫ!

У чэрвені адбудзецца агляд факультэцкіх насценгазет, прысвечаны 30-годдзю вызвалення Беларусі.

На кожным факультэце неабходна да 10 чэрвеня стварыць экспазіцыі газетных нумароў сёлетняга навучальнага года.

Абмеркаванне ў журы — з 10 па 15 чэрвеня.

За даведкамі звяртацца ў рэдакцыю шматтыражнай газеты. (Тэлефон 22-07-19).

АРГКАМІТЭТ.

Штаб працоўных спраў БДУ аб'яўляе конкурс на лепшы атрадны фотаальбом-летапіс працоўнага семестра-74. Альбом павінен найбольш поўна адлюстроўваць працоўныя справы, грамадскае і культурнае жыццё байцоў СБА.

Вынікі конкурсу будуць падведзены да 1 кастрычніка 1974 года. Пераможцаў чакаюць прэміі і граматы камітэта камсамола.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём—1 друк. ар. Газета выходзіць па чацвяргах.

Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 11227

Зак. 719.